стакан, кусочек корицы (дарчин) или имбиря. Есть три вида чая – обычный, вишневый и из корицы.

Таким образом, иранские напитки является не только важной частью гастрономических национальных традиций, но форм социально-досувой деятельностью и элементами национального кейтеринга.

1. Питт, Ж.-Р. Гастрономическая география : между глобализацией и локальным укоренением / Ж.-Р. Питт // Знание сила. – 2002. – № 3. – С. 85–88.

2. Николаев, О. Чаепитие / О. Николаев // Знание сила. – 2006. – № 9. – С. 103–110.

3. Баранов, Д.А. Об особенностях этнографического изучения пищи / Д.А. Баранов // Д.А. Баранов. Питание в культуре этноса : Материалы Шестых Санкт-Петербургских этнографических чтений. СПб. : РГПУ им. А.И. Герцена,2007. – С. 7–10.

**Скілондзь С.А.,** студ. 511 гр.
Навуковы кіраўнік – Смарговіч І.Л.

## ДЗЕЙНАСЦЬ ЦЭНТРАЎ РАМЁСТВАЎ І ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ ПА ЗАХАВАННЮ І АДРАДЖЭННЮ ТРАДЫЦЫЙ НАРОДНАЙ МАСТАЦКАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ

У XXI ст., дзякуючы тэхналагічнаму прагрэсу, інтэрнэту, шырокай даступнасці падарожнічаць, мы атрымоўваем магчымасць бесперашкодна вывучаць асаблівасці культуры іншых краін. Больш таго, назіраецца сціранне межаў паміж культурамі і іх дыфузія. Аднак, гэты працэс, на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

жаль, адбываецца не на карысць нашай роднай культуры: часцей пераймаюцца замежныя культурныя узоры і асаблівасці. У такім выпадку беларуская культура губляе сваю самабытнасць і, што не менш важна, каштоўнасць і значнасць для новых пакаленняў.

Захаванне традыцыйнай культуры сваёй краіны – адзін з галоўных накірункаў дзейнасці не толькі кожнай дзяржавы, але і кожнага грамадзяніна. Як вядома, будучыня будуецца на традыцыях народа, і чым больш яны шануюцца, тым мацней «падмурак» для гэтага будаўніцтва. Сапраўды, чалавек усведамляе сябе чалавекам дзякуючы таму, што ведае сваю мінуўшчыну, карані продкаў, тое, адкуль выйшла яго нацыя. Ёсць шэраг такіх з’яў культуры мінуўшчыны, якія, нягледзячы на архаічнасць, наіўнасць, у нечым і прымітыўнасць дапамагаюць сучаснаму чалавеку лепш зразумець сваё месца ў сучаснай культуры, сфармуляваць сваё стаўленне да яе [2, с. 9].

Тэма адраджэння традыцый народнай мастацкай культуры адносна новая. Актыўна яна стала вывучацца ў канцы XX ст., калі Рэспубліка Беларусь атрымала поўны суверэнітэт і беларускае грамадства звярнула ўвагу на асаблівасці сваёй культуры і сваіх традыцый. Феномен традыцыйнай культуры атрымаў шырокае навуковае абмеркаванне. Шмат навуковых даследчыкаў разглядаюць гэта пытанне з розных кропак гледжання.

Функцыянаванне традыцыйнай культуры з пазіцыі культуралогіі разгледжана ў артыкулах А.І. Смоліка, Э.К. Дарашэвіча, І.І. Крука. Аўтараў асабліва хвалюе будучыня грамадства, у якім каштоўнасць традыцый актыўна згасае. Праблема захавання і трансляцыі ў пакаленнях традыцыйнага этнічнага мастацтва як адной з гісторыка-культурных каштоўнасцей народа у сучасных урбанізаваных умовах хвалюе і Т.А. Пладунову, якая акрамя таго ў традыцыйнай культуры бачыць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

педагагічны патэнцыял. Вялікую ролю міжпакаленным сувязям у працэсе пераемнасці традыцыйнай мастацкай культуры таксама адвозіць Л.П. Сівурава. Пры вывучэнні пытання трансляцыі беларускіх традыцый, варта звярнуць увагу на працы А.М. Баганевай і В.А. Лабачэўскай, якія аналізуюць дзенасць новых тыпаў установ культуры, перадумовы іх фарміравання і станаўлення.

Праблема адраджэння традыцыйнай мастацкай культуры разглядаецца вельмі рознабакова. Аўтараў і прац вельмі шмат, што падцвярджае значнасць гэтай тэмы і неабыякавасць да яе, ў тым ліку і ў навуковых колах. Аналіз розных поглядаў на дадзеную праблему дастаткова поўна раскрыты ў артыкуле Д.Ю. Матуйза «Феномен традыцыйнай культуры ў сучасным грамадстве: да пытання вызначэння паняцця». Д.Ю. Матуйза адзначае некалькі падыходаў да вызначэння паняцця традыцыйнай культуры ў сучаснасці:

1. Архаічны пласт традыцыйнай культуры не проста існуе, але і функцыянуе ў сучасным грамадстве. Сфера яго бытавання абмежаваная, дадзеная культура знаходзіцца пад пагрозай знікнення. Прыхільнікі гэтай кропкі гледжання – Т.А. Пладунова, Э.К. Дарашэвіч, Л.П. Сівурава – заклікаюць не толькі захоўваць традыцыі, але і адраджаць іх.

2. Традыцыйная культура безумоўна мае каштоўнасць, аднак, сутнасць і характар яе функцыянавання, а гэтак жа формы праявы ў сучаснай культуры значна змяніліся (Г.Ф. Шаура, А.У. Марозаў, С.Ю. Няклюдаў, А.У. Косціна).

3. Немагчымасць існавання традыцыйнай культуры ў яе аўтэнтычным варыянце ў кантэксце сучаснай культуры, паколькі дадзены тып можа існаваць толькі ва ўмовах традыцыйнага грамадства (Х.С. Гафараў і Ю.Ю. Гафарава, А.Я. Фліер, А. Хансан) [3].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Кожны з пералічаных падыходаў з’яўляецца цікавым для разважання пра сутнасць паняцця традыцыйнай культуры і яе месца ў сучасным грамадстве. Пры вывучэнні розных напрамкаў мы для сябе вылучылі наступную пазіцыю: неабходнасць захавання архаічных аспектаў традыцыйнай культуры, а таксама яе адраджэнне праз трансфармацыю ў сучасныя формы і сінтэз з новымі напрамкамі мастацтва. Гэта абумоўлена галоўным чынам тым, што сучаснае грамадства не заўсёды гатова ўспрымаць традыцыйную культуру ў яе першапачатковым выглядзе. Таму для далучэння да яе новага пакалення неабходна змяненне форм традыцыйнай культуры, яе частковае «асучасніванне».

Усведамляючы значнасць традыцыйнай мастацкай культуры для захавання маральных каштоўнасцей грамадства і яго гарманічнага развіцця, пачынаючы з апошняга дзесяцігоддзя XX ст., вядзецца шырокая работа па арганізацыі працэса перадачы традыцый ад пакалення да пакалення і ўключэння ў гэты працэс моладзі.

Найбольш эфектыўная і цалкам сучасная форма такой перадачы і пераемнасці традыцый – новыя тыпы устаноў культуры ў галіне адраджэння традыцый народнага мастацтва. Да гэтага спісу ў тым ліку адносяцца Цэнтры (Дамы) рамёстваў – аднапрофільныя ўстановы культуры, змест дзейнасці якіх тычыцца народных промыслаў і рамёстваў – і установы комплекснага характару – Цэнтры (Дамы) традыцыйнай культуры, дзе надаецца ўвага формам і матэрыяльнай, і духоўнай культуры (народныя рамёствы, абрады, песні, музыка, танцы) [1]. Можна адзначыць, што адным з асноўных напрамкаў дзейнасці такіх устаноў культуры на сучасным этапе з’яўляецца не толькі арганізацыя вольнага часу насельніцтва, але і далучэнне яго да працэссу вытворчасці, захавання, распаўсюджвання і засваення культурных каштоўнасцей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Усяго ў рэспубліцы налічваецца каля 350 устаноў новага тыпу, арыентаваных на захаванне традыцый народнага мастацтва Беларусі. У горадзе Слуцку гэтай важнай справай займаецца Цэнтр традыцыйнай культуры, які быў створаны ў лістападзе 2010 г. рашэннем Слуцкага раённага выканаўчага камітэта.

Усе задачы, якія ставяць перад сабой і паспяхова вырашаюць ў сваёй практычнай дзейнасці работнікі Цэнтра, патрабуюць шырокага спектра формаў і метадаў працы з рознымі катэгорыямі насельніцтва. Гэта стварэнне аматарскіх калектываў, правядзенне святаў і абрадаў, арганізацыя выстаў, сустрэчы з майстрамі Случчыны. За 2015 г. Цэнтрам было арганізавана і праведзена 95 мерапрыемстваў, удзельнікамі якіх сталі болей 10 000 чалавек. З іх: 47 абрадавых святаў, прадстаўленняў і масавых мерапрыемстваў. Арганізавана больш за 180 заняткаў па авалодванні майстэрствам па накірунках народных рамёстваў.

Далучэнне да традыцыйных народных рамёстваў дзяцей і падлеткаў адбываецца з дапамогай прываблівання ў аматарскія калектывы і майстэрні. Пры ўстанове дзейнічаюць наступныя аматарскія калектывы: калектыў «Беларуская лялька», калектыў па саломапляценні «Саламянае суквецце», калектыў па габяленапляценні «Кудзесніца», калектыў аматарскай мастацкай творчасці «Батлейка». У цэнтры працуюць шэраг майстэрняў па захаванню і адраджэнню народных рамёстваў: майстэрня «Тэра» захоўвае мастацкія асаблівасці лепкі з гліны, ткацкія традыцыі адраджае майстэрня «Узоры даўніны», традыцыйнае ў сучасным увасабляюць майстэрня дызайна адзення з элементамі народнага касцюма «Куфар» і майстэрня лапікавага шыцця «Лапікавая казка».

У апошні час вельмі прыкметна і імпульсіўна пачаўся працэс адраджэння традыцыйнай народнай мастацкай культуры літаральна ва ўсіх яе праявах. Вялікае значэнне стала мець правядзенне народных святаў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абрадаў, звычаяў. Менавіта шляхам інсцэніроўкі народных святаў, прысвяткаў, звычаяў і праз увасабленне іх як у сцэнічным варыянце, так і непасрэдна на ўлонні прыроды, плошчах і вуліцах горада, больш поўна і змястоўна можна данесі да народа ўзоры народнага мастацтва. Гэту функцыю у Цэнтры традыцыйнай культуры выконвае этнаграфічны клуб «Беларуская хатка».

Такім чынам, Слуцкі цэнтр традыцыйнай культуры не толькі падтрымлівае і стварае ўмовы для дзейнасці, накіраванай на захаванне, і прапаганду гісторыка-культурнай спадчыны, але і адраджае, аднаўляе праз дзейнасць сваіх майстроў традыцыі мастацкай культуры ў новых, сучасных формах, спалучаючых у сабе лепшыя традыцыйныя рысы і сучасныя мастацкія накірункі. Увогуле, можна адзначыць станоўчую тэндэнцыю па павышэнню цікавасці да захавання і адраджэння традыцый народнай мастацкай культуры Беларусі, што пацвярджаецца вялікай колькасцю напрамкаў даследванняў гэтай тэмы, яе тэарэтычнае абгрунтаванне, а таксама дзейнасцю новых тыпаў устаноў (у тым ліку Цэнтраў рамёстваў і традыцыйнай культуры) па перадачы і пераемнасці традыцый.

---

1. Боганева, А.М. Новыя тыпы ўстаноў культуры і клубных фарміраванняў у галіне традыцыйнай культуры/ А.М. Боганева, В.А. Лабачэўская//Веснік БелІПК : навук.–метад. зб. – Мн. : БелІПК, 1999. – С. 88–103.

2. Дарашэвіч, Э.К. Нематэрыяльная культурная спадчына ў структуры сучаснай культуры / Э.К. Дарашэвіч // Культура ва ўмовах глабалізацыі : матэрыялы навуковай канферэнцыі (25–26 лістапада 2009 г.) / Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў. – Мінск, 2010. – С. 182–186.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Матуйзо, Д.Ю. Феномен традиционной культуры в современном обществе: к проблеме определения понятия / Д.Ю. Матуйзо // Культура : открытый формат – 2013 (библиотековедение, библиографоведение и книговедение, искусствоведение, культурология, музееведение, социокультурная деятельность) : сборник научных статей / Белорусский государственный университет культуры и искусств. – Минск, 2013. – С. 81–85.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Скороходкина Д.Н.,** студ. 411 гр.
Научный руководитель – Чернявская Ю.В.

## СТЕРЕОТИП КАК ОСНОВА ФОРМИРОВАНИЯ КУЛЬТУРНОЙ НЕПРИЯЗНИ

Составляя собирательный образ взглядов современного общества, нетрудно заметить одно общее распространённое мнение: другие культуры, нации, мультикультурализм, меньшинства, различия воспринимаются обществом как проблема. Как проблема, которую каким-то образом нужно решать. Как проблема, потому что существует глубоко укоренившийся образ «своего» и «чужого». Как проблема, потому что общество тяготеет к одинаковости, которая как бы гарантирует отсутствие угрозы со стороны «чужого». Под угрозой же, видимо, понимается возможность разрушение привычного, знакомого, выход из рамок «своего» и перестройка своих мнений и ценностей. Настоящая же проблема как раз и заключается в закрытости и «единственности» общества.

Каждая человеческая общность (семья, студенческая группа, жители столицы, представители одной культуры) в определённом смысле строится